**РЭГЛАМЕНТ ПРАГРАМЫ РЭЗІДЭНЦЫІ ДЛЯ ПІСЬМЕННІ(Ц)КАЎ, ДРАМАТУРГАЎ І ПЕРАКЛАДЧЫ(Ц)КАЎ, называнай далей ЛІТАРАТУРНЫМІ РЭЗІДЭНЦЫЯМІ ВАРШАВЫ**

**Тлумачэнне выкарыстаных тэрмінаў**

**Арганізатар:** Старамесцкі Дом культуры ў Варшаве

**Партнёры**: Таварыства Літаратурная Унія, Таварыства перакладчыкаў літаратуры, Інстытут гарадской культуры ў Гданьску, Кракаўскае фестывальнае агенцтва

**Камісія:** Прадстаўнік/прадстаўніца Старамесцкага Дому культуры, прадстаўнік/ прадстаўніца Таварыства Літаратурная Унія, а таксама прадстаўнік/прадстаўніца Таварыства перакладчыкаў літаратуры.

**Заяўнік/Заяўніца**: творца ў галіне літаратуры (паэзія, проза, эсэістыка, літаратурны пераклад, дзіцячая літаратура, драматургія), які прэтэндуе на Літаратурную Рэзідэнцыю.

**Рэзідэнт/Рэзідэнтка:** творца ў галіне літаратуры (паэзія, проза, эсэістыка, літаратурны пераклад, дзіцячая літаратура, драматургія), які атрымаў рашэнне аб творчым побыце ў рамках Літаратурнай Рэзідэнцыі.

**Літаратурная Рэзідэнцыя**: творчы побыт у Варшаве, у рамках якога Рэзідэнт/Рэзідэнтка працуе над літаратурным, драматургічным тэкстам або перакладам, прапанаваным падчас адбору.

**Месца Літаратурных Рэзідэнцый:** Варшава.

**§1**
**Арганізатары і крыніцы фінансавання Рэзідэнцый**

1. Літаратурныя Рэзідэнцыі ў горадзе Варшаве арганізуе Старамесцкі Дом культуры ў Варшаве па даручэнні Упраўлення горада Варшавы.
2. Праграма рэалізуецца ў супрацоўніцтве з Партнёрамі.
3. Праграма фінансуецца Упраўленнем горада Варшавы.

**§2**
**Мэты Літаратурных Рэзідэнцый**

1. Мэтай арганізацыі Літаратурных Рэзідэнцый з'яўляецца прапаганда Варшавы як горада, прыязнага да культуры, у прыватнасці, да літаратуры; і распаўсюджванне ведаў пра сучасную і гістарычную Варшаву сярод літаратурных творцаў з з Беларусі і Украіны.
2. Мэтай Літаратурных Рэзідэнцый з'яўляецца забеспячэнне творцаў умовамі працы ў выглядзе стыпендыі, побыту ў Варшаве, а таксама ідэйнай і рэкламнай падтрымкай.
3. Арганізатар падтрымае рэалізацыю пранкта, прапанаванага Рэзідэнтам/ Рэзідэнткай на этапе адбору.

**§3**
**Правамоцныя Заяўнікі**

1. У праграме Літаратурных Рэзідэнцый могуць удзельнічаць паўналетнія фізічныя асобы з поўнай юрыдычнай дзеяздольнасцю:
    a. якія займаюцца творчасцю ў галіне літаратуры (паэзія, проза, эсэістыка, літаратурны пераклад, дзіцячая літаратура, драматургія),
    b. якія паходзяць з Беларусі або Украіны,

c. маюць хаця б адну выдадзеную кнігу, том паэзіі або пераклад.

2. Заяўнікамі не могуць быць асобы, звязаныя шлюбам, якія знаходзяцца ў сваяцкіх стасунках або сувязях па прамой лініі; знаходзяцца ў працоўных або дамоўных стасунках з Арганізатарам або чальцамі кіруючых ці кантрольна- наглядных органаў Партнёраў.

## §4
## Тэрміны і правілы адбору

1. Для рэалізацыі Літаратурных Рэзідэнцый Арганізатар правядзе адбор на ўмовах, вызначаных ніжэй.
2. У 2024 годзе будуць абраныя як мінімум пяць Рэзідэнтаў/Рэзідэнтак, якія будуць запрошаныя да ўдзелу ў праграме Літаратурных Рэзідэнцый.
3. Арганізатар абвяшчае два наборы ў рэзідэнтуры ў 2023 годзе на наступныя даты:
   - з 13 лістапада 2023 года па 26 лістапада 2023 года для рэзідэнтуры ў перыяд студзень-чэрвень 2024 года;
   - з 6 мая 2024 года па 19 мая 2024 года для рэзідэнтуры ў перыяд ліпень-снежань 2024 года.
4. Заяўнікі/Заяўніцы павінны запоўніць анлайн-форму на сайце www.sdk.pl, якая будзе ўключаць наступную інфармацыю на польскай, англійскай, украінскай ці беларускай мовах:

   a. асабістыя дадзеныя: імя і прозвішча, грамадзянства, адрас e-mail, нумар мабільнага тэлефона, адрас пражывання

   b. сяброўства ў арганізацыі пісьменнікаў ці перакладчыкаў,

   c. прыблізная дата і працягласць побыту,

   d. пацверджанне прачытання і прыняцця гэтага Рэгламенту,

   e. выражэнне згоды на апрацоўку персанальных дадзеных з мэтай адбору - прыняцце RODO,

   f. апісанне рэзідэнцыйнага праекта, г. зн. ідэі тэксту, які можа паўстаць падчас рэзідэнцыі,

   g. апісанне найважнейшых дасягненняў, уключаючы спіс узнагарод, публікацый, рэзідэнцый, працы ў прафесіі,

   h. апісанне адукацыі,

   i. інфармацыя пра тое, ці ёсць у Заяўніка/Заяўніцы ёсць адна апублікаваная кніга, паэтычны зборнік ці пераклад, і ўказанне назвы, выдавецтва, года публікацыі.

5. У межах гэтага адбору кожны Заяўнік/Заяўніца можа падаць максімум адну заяўку.
6. Заяўкі, якія не адпавядаюць фармальным патрабаванням, устаноўленым у §3 і §4, альбо з'яўляюцца няпоўнымі, будуць адхіленыя.
7. Пытанні пра адбор можна дасылаць па электроннай пошце на наступны адрас: rezydencje@sdk.pl.
8. У выпадку недастатковай колькасці заявак Арганізатар пакідае за сабой права абвесціць тэрміны дадатковых адбораў.

## §5
## Ацэнка заявак

1. Пададзеныя заяўкі будуць ацэньвацца Камісіяй у складзе: прадстаўнік/ прадстаўніца і сакратар/сакратарка Старамесцкага дома культуры, прадстаўнік/ прадстаўніца Таварыства Літаратурная Унія і прадстаўнік/ прадстаўніца Таварыства перакладчыкаў літаратуры.
2. Камісія вывучыць усе заяўкі, якія адпавядаюць фармальным крытэрыям, прымаючы пад увагу:

   a. папярэдні досвед Заяўніка/Заяўніцы;

   b. змястоўны ўзровень апісання літаратурнага альбо перакладчыцкага

праекта, які Рэзідэнт/Рэзідэнтка будзе рэалізоўваць падчас побыту;
с. мастацкую і/або адукацыйную вартасць праекта.

3. Камісія будзе ўлічваць прынцыпы роўнасці і захавання разнастайнасці з пункту гледжання полу, мовы і паходжання Рэзідэнтаў/Рэзідэнтак.
4. Камісія складзе рэзервовы спіс Заяўнікаў/Заяўніц, якія будуць запрошаныя ў выпадку, калі іншы Заяўнік/Заяўніца не зможа браць удзел у рэзідэнцыі на працягу прапанаванага або пажаданага тэрміну.
5. Вынікі першага набору будуць абвешчаны 8 снежня 2023 года, а другога набору — 31 мая 2024 года на сайце: www.sdk.pl
6. Рашэнне Камісіі з'яўляецца канчатковым і не можа быць абскарджана.

**§6**
**Правілы побыту ў Рэзідэнцыі і абавязальніцтвы Рэзідэнтаў**

1. Побыт ў Варшаве ў рамках праграмы Літаратурных Рэзідэнцый павінен працягвацца ад 2 да 6 тыдняў. Дакладныя даты побыту будуць узгодненыя індывідуальна з кожным Заяўнікам/Заяўніцай, абранымі Камісіяй.
2. Рэзідэнты/Рэзідэнткі павінны набыць страхоўку на час знаходжання ў Рэзідэнцыі.
3. У абгрунтаваных выпадках Бакі могуць дамовіцца аб змене даты пражывання, у прыватнасці ў выпадку хваробы, карантыну ці іншых непрадбачаных абставінаў.
4. У рамках стыпендыі рэзідэнт мае права на наступныя паслугі:
   - а) грашовыя сродкі ў памеры 120 злотых брута штодня, памножаныя на колькасць дзён пражывання ў месцы жыхарства,
   - б) пражыванне ў Варшаве,
   - в) па магчымасці Арганізатара — на ідэйную, арганізацыйную і рэкламную падтрымку Рэзідэнцыі.
5. Стыпендыя можа быць выкарыстаная для пакрыцця выдаткаў, звязаных з развіццём інтарэсаў і талентаў Рэзідэнта/Рэзідэнткі і развіццём літаратурнай дзейнасці.
6. Матэрыялы, неабходныя для рэалізацыі канцэпцыі і пакрыцця выдаткаў на праезд Рэзідэнт/Рэзідэнтка пакрывае за ўласны кошт.
7. Цягам 30 дзён пасля заканчэння побыту Рэзідэнты/Рэзідэнткі павінны прадставіць аднастаронкавы водгук пра Рэзідэнцыю і адправіць яго па адрасе: rezydencje@sdk.pl.
8. Рэзідэнты/Рэзідэнткі прыкладуць усе намаганні, каб усе выданні твораў, створаных цалкам альбо часткова падчас Рэзідэнцыі, у выходных звестках мелі наступную формулу: "Твор паўстаў дзякуючы падтрымцы Праграмы Літаратурных Рэзідэнцый горада Варшавы”.
9. Падрабязныя абавязальніцтвы Рэзідэнта/Рэзідэнткі ў рамках рэалізацыі Рэзідэнцыі вызначаныя ў дамове, заключанай з Арганізатарам у індывідуальным парадку.

**§7**
**Апрацоўка асабістых дадзеных**

На падставе арт. 13 раздзела 1 пастановы Еўрапейскага парламента і Рады ЕС 2016/679 ад 27 красавіка 2016 года аб абароне фізічных асобаў пры апрацоўцы асабістых дадзеных і аб свабодным перамяшчэнні такіх дадзеных, а таксама аб адмене Дырэктывы 95/46/WE (Агульная пастанова аб абароне дадзеных) - далей: RODO, паведамляем, што адміністратарам асабістых дадзеных Заяўніка/Заяўніцы з'яўляецца: **Старамесцкі Дом культуры з сядзібай у Варшаве па адрасе Rynek Starego Miasta 2, 00-272 Warszawa**

1) На падставе дзеючых правілаў мы прызначылі супрацоўніка па абароне дадзеных, з якім можна звязацца поштаю на адрас: **Inspektor Ochrony Danych Osobowych, Staromiejski Dom Kultury, Rynek Starego Miasta 2, 00-272 Warszawa** альбо праз

элетронную пошту: **iodo@sdk.pl**

2) Персанальныя дадзеныя, атрыманыя ў сувязі з заключэннем дамовы з Заяўнікам/Заяўніцай, будуць апрацоўвацца для наступных мэтаў:

- рэгістрацыі, падаткаў і страхавання,
- звязаных з даследаваннем магчымых прэтэнзій і шкодаў,
- рэагавання на лісты, заявы і скаргі Заяўніка/Заяўніцы,
- прадастаўлення адказаў на разгляд справаў.

3) Прававой асновай для апрацоўкі дадзеных Заяўніка/Заяўніцы з'яўляецца:

- неабходнасць выканання дамовы альбо прыняцця мер па запыце Заяўніка/Заяўніцы перад заключэннем дамовы (артыкул 6 (1) (f) RODO),
- неабходнасць выканання юрыдычных абавязальніцтваў, якія ляжаць на Адміністратары (артыкул 6 (1) (f) RODO),
- неабходнасць у мэтах, якія вынікаюць з законных інтарэсаў, якія перасследуюцца Адміністратарам (артыкул 6 (1) (f) RODO

4) Прадастаўленне асабістых дадзеных з'яўляецца добраахвотным, але неабходным для заключэння і выканання дамовы.

5) Персанальныя дадзеныя, атрыманыя ад Заяўніка/Заяўніцы, могуць быць перададзеныя: суб'ектам, якія іх апрацоўваюць па нашым запыце, а таксама органам улады або дзяржаўным структурам, упаўнаважаным атрымліваць дадзеныя на падставе дзеючага заканадаўства, напрыклад, судам, праваахоўным органам альбо органам мясцовага самакіравання і дзяржаўным установам, калі яны звяртаюцца з просьбай на адпаведнай прававой падставе.

6) Дадзеныя Заяўніка/Заяўніцы не будуць перададзены ў трэція краіны.

7) Перыяд апрацоўкі персанальных дадзеных залежыць ад мэты, з якой апрацоўваюцца дадзеныя. Перыяд, на працягу якога будуць захоўвацца асабістыя дадзеныя, разлічваецца на падставе наступных крытэрыяў:

- працягласць дамовы,
- юрыдычныя падставы, якія могуць абавязаць нас апрацоўваць дадзеныя на працягу пэўнага перыяду часу
- перыяд, неабходны для абароны нашых інтарэсаў.

8) Апрача таго, інфармуем, што Заяўнік/Заяўніца мае права да:

- доступу да сваіх асабістых дадзеных
- запыту аб выпраўленні сваіх асабістых дадзеных, якія з'яўляюцца няправільнымі, і дапаўненне няпоўных асабістых дадзеных
- запыту аб выдаленні сваіх асабістых дадзеных, у прыватнасці, у выпадку адклікання згоды на апрацоўку, калі няма іншай прававой падставы для апрацоўкі
- просьбы абмежаваць апрацоўку сваіх асабістых дадзеных
- унясення пратэсту супраць апрацоўкі сваіх дадзеных у сувязі з асаблівым становішчам Заяўніка/Заяўніцы ў выпадках, калі мы апрацоўваем дадзеныя на падставе нашых законных інтарэсаў альбо для мэтаў прамога маркетынгу
- падачы скаргі ў наглядны орган, які займаецца абаронай асабістых дадзеных, гэта значыць да прэзідэнта Управы па абароне персанальных дадзеных.

9) У выпадку, калі дадзеныя Заяўніка/Заяўніцы апрацоўваюцца на падставе згоды - Заяўнік/Заяўніца мае права ў любы час адклікаць згоду на апрацоўку дадзеных. Адкліканне згоды не ўплывае на законнасць апрацоўкі, якая праводзілася на падставе згоды Заяўніка/Заяўніцы заяўніка да яго адклікання. Заяўнік/Заяўніца можа адклікаць згоду, адправіўшы заяву аб адкліканні згоды на наш паштовы або электронны адрас.

10) Калі ласка, звярніце ўвагу, што мы не выкарыстоўваем сістэм для аўтаматызаванага прыняцця рашэнняў.

**§8**

**Заключныя палажэнні**

1. Арганізатар пакідае за сабой права вырашаць спрэчкі і пытанні, якія не падпадаюць пад Рэгламент.
2. Арганізатар пакідае за сабой права ўнесці змены ў Рэгламент ў выпадку форс-мажорных абставінаў. Зменены Рэгламент ўступае ў сілу з моманту яго апублікавання на сайце sdk.pl. У той жа час змены ў Рэгламенце будуць накіраваныя Заяўнікам/Заяўніцам, якія падалі заявы на Рэзідэнцыю да даты змены Рэгламента.
3. У выпадку форс-мажорных сітуацый Арганізатар пакідае за сабой права адмяніць адбор і праграму рэзідэнцый.
4. Адмова Рэзідэнта/Рэзідэнткі ад удзелу ў Рэзідэнцыі магчымая на ўмовах, указаных у дамове.
5. У выпадку змены адраса для карэспандэнцыі Заяўнік/Заяўніца абавязаныя неадкладна паведаміць пра гэта Арганізатару для зняцця адказнасці Арганізатара за наступствы непрадастаўлення Заяўніку/Заяўніцы карэспандэнцыі, звязанай з рэалізацыяй гэтага Рэгламента.
6. У пытаннях, якія не рэгулююцца Рэгламентам, прымяняюцца палажэнні польскага заканадаўства, уключаючы Грамадзянскі кодэкс і законы аб аўтарскім праве і сумежных правах.
7. Рэгламент уступае ў сілу з дня яго абвяшчэння.
8. Любыя пытанні, звязаныя з Рэзідэнцыяй і гэтым Рэгламентам, павінны накіроўвацца толькі па адрасе: rezydencje@sdk.pl.
9. Гэты Рэгламент складзены на польскай, беларускай і украінскай мовах. У выпадку супярэчнасцяў паміж дзвюма моўнымі версіямі перавага будзе аддадзеная польскай версіі.

**Дадаткі:**

1. Узор дамовы з Рэзідэнтам/Рэзідэнткай.